## НАШЕ НАСЛЕДИЕ

С.Я. Новікаў

# «МАЛАЯ ЗАЛА ААН» МІНСКАГА ІНЯЗА

В статье автор впервые показывает важнейшие страницы истории Минского государственного педагогического института иностранных языков, относящиеся к 1960-м годам, когда многие достижения в его развитии были связаны с именем второго ректора института – Фрола Парфирьевича Шмыгова. Благодаря огромному вниманию и неустанным усилиям по поиску адекватных времени практических решений ему удалось не только значительно расширить материально-техническую базу института, усовершенствовать учебно-воспитательный процесс, придать положительную динамику научно-исследовательской работе, но и сформировать уникальный облик ведущего лингвистического учебного заведения. В перечне особых, но вполне закономерных открытий той поры – созданный в стенах института так называемый «малый зал Организации Объединенных Наций».



1960-я гады ў гісторыі Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў (МДПІЗМ), ці Мінскага іняза, трывала звязаны з дзейнасцю рэктара – Фрола Парфіравіча Шмыгава. За той час былі закладзены, пабудаваны і ўведзены ў строй 2 вучэбныя карпусы, пачалася падрыхтоўка настаўнікаў іспанскай мовы і перакладчыкаў-рэферэнтаў, колькасць кафедраў і студэнтаў павялічылася больш чым утрая, адкрыў дзверы новы інтэрнат і распачыналася будаўніцтва яшчэ аднаго, пачала сваю дзейнасць аспірантура, быў упершыню створаны Рэдакцыйна-выдавецкі савет інстытута і многа іншага. Як вынікае нават з названых фактаў, за адно дзесяцігоддзе сваёй дзейнасці на пасадзе рэктара падмурак педагагічнай адукацыі ў БССР стаў яшчэ больш трывалым і значна ўзбагацілася сфера развіцця лінгвістычнай навукі ў краіне. У характарыстыцы на Ф.П. Шмыгава ў сувязі з прадстаўленнем у ВАК СССР хадайніцтва аб прысваенні яму вучонага звання прафесара адзначалася, што дзякуючы ініцыятыве рэктара інстытут пераўтварыўся ў адну з буйнейшых у краіне вучэбных устаноў свайго профілю [1, арк. 41].

Цікавымі будуць для чытача малавядомыя радкі працоўнай біяграфіі выпускніка гістарычнага факультэта Пермскага (з 1940 па 1957 – г. Молатаў) педінстытута, дзе з верасня 1932 г. дзевятнаццігадовы студэнт Фрол Шмыгаў пачаў навучацца на спецыяльнасці эканамічных дысцыплін. Вышэйшую адукацыю юнак з беларускай сялянскай сям'і, якая жыла ў вёсцы Петухі Ключэўскага раёна Алтайскага краю, атрымаў за тры гады (1932–ліпень 1935). Але працоўную дзейнасць ён пачаў яшчэ да паступлення ў інстытут, у лістападзе 1931 г., калі выкладаў грамадазнаўства ў школе ФЗУ ў рабочым пасёлку Багаслоўск Свярдлоўскай вобласці. Пасля заканчэння інстытута на працягу некалькіх месяцаў выконваў абавязкі намесніка загадчыка аддзела

прапаганды Пермскага гаркама ВЛКСМ. З лістапада 1935 па студзень 1937 г. служыў у Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі ў сталіцы Грузіі г. Тбілісі. Пасля арміі працаваў загадчыкам аддзела прапаганды райкама ВЛКСМ г. Перм. З лістапада 1937 па чэрвень 1938 г. – настаўнік гісторыі ў старэйшых класах Пермскай сярэдняй школы № 32. Да лютага 1939 г. быў асістэнтам на кафедры палітэканоміі Пермскага педінстытута. З лютага 1939 па верасень 1941 г. – старшы выкладчык кафедры асноў марксізму-ленінізму. З верасня 1941 па жнівень 1942 г. загадваў гэтай жа кафедрай.

На працягу двух наступных гадоў Ф.П. Шмыгаў з'яуляўся слухачом Вышэйшай дыпламатычнай школы Міністэрства замежных спраў СССР у Маскве, дзе закончыў поўны курс заходняга факультэта (французскае аддзяленне), пасля чаго быў размеркаваны на працу ў Міністэрства замежных спраў БССР, дзе загадваў палітычным аддзелам з верасня 1944 па сакавік 1948 г. У той час адной з важных жыццёвых вех 31-гадовага дыпламата стаў удзел у складзе афіцыйнай дэлегацыі БССР у канферэнцыі 50 дзяржаў – заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (адбылася 25.04.–26.06.1945 у г. Сан-Францыска, ЗША).

З сакавіка 1948 да красавіка 1949 г. – саіскальнік на курсах дысертантаў у Акадэміі грамадскіх навук (АГН) пры ЦК УКП(б), паспяховая абарона дысертацыі на ступень кандыдата гістарычных навук. Як вядома, у адпаведнасці з распараджэннем СНК Саюза ССР ад 12 мая 1944 года, асобы, якія закончылі Вышэйшую дыпламатычную школу, пры абароне кандыдацкай дысертацыі па гісторыі міжнародных адносін, гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі і міжнароднаму праву вызваляюцца ад здачы кандыдацкага мінімуму [1, арк. 38]. Не меншую цікавасць могуць выклікаць і такія факты з навуковай біяграфіі гісторыка-дыпламата. Паводле пратакола пасяджэння вучонага савета АГН пры ЦК УКП(б) ад 8 ліпеня 1949 г., гэтай датай зацвярджалася рашэнне кафедры міжнародных адносін аб прысуджэнні вучонай ступені кандыдата гістарычных навук Шмыгаву Фролу Парфіравічу, які 28 красавіка 1948 г. абараніў дысертацыю на тэму "Міжнародная сістэма апекі" [1, арк. 11]. Пасля гэтага вярнуўся на папярэдняе месца працы ў МЗС БССР.

У адпаведнасці з загадам Міністра асветы БССР ад 27 жніўня 1949 г. Ф.П. Шмыгаў прызначаўся намеснікам дырэктара па вучэбнай і навуковай частцы МДПІЗМ [1, арк. 3]. У сакавіку 1951 г. рашэннем ВАК СССР ён быў зацверджаны ў вучоным званні дацэнта па кафедры асноў марксізму-ленінізму [1, арк. 40]. На пасадзе намесніка дырэктара Ф.П. Шмыгаў працаваў да красавіка 1952 г., калі быў пераведзены на пасаду прарэктара БДУ імя Леніна. Праз 9 гадоў увосень 1961 г. ён зноў вяртаецца ў Мінскі іняз, але на гэты раз у якасці рэктара.

Галоўным для Ф.П. Шмыгава на пасадзе рэктара заставаўся клопат аб пашырэнні матэрыяльнай базы інстытута, у першую чаргу, будаўніцтве новых вучэбных карпусоў і інтэрнатаў для студэнтаў. Так, пры наборы 300 студэнтаў на I курс у 1961 г. атрымлівалася, што ў 1961/62 навучальным годзе на стацыянары павінна займацца 117 груп, на завочным аддзя-

ленні – 34, у той час як вучэбны корпус (адкрыты ў 1958 г.) інстытута меў толькі 33 вучэбныя аўдыторыі. Таму заняткі ішлі ў тры змены: у 1-ю займаліся студэнты факультэтаў нямецкай і французскай моў, у 2-ю – факультэта англійскай мовы, у 3-ю – падрыхтоўчыя курсы. Недастатковай была колькасць месцаў у інтэрнаце, разлічаным на 400 чалавек, пры агульнай колькасці студэнтаў каля 1500 (па штатным раскладзе на 1961 г. на дзённым аддзяленні займаліся 968, на завочным – 464 студэнты) [2, арк. 2–3].

У пачатку 1963 г. пачалося будаўніцтва другога вучэбнага корпуса агульнай плошчай 3700 м², які быў уведзены ў эксплуатацыю ў верасні 1964 г. Калі ў 1963/64 навучальным годзе на аднаго студэнта прыходзілася 0,78 м², дык у 1964/65 – 2,2 м². Студэнты інстытута атрымалі магчымасць займацца на вучэбных плошчах уласнага інстытута (да гэтага часу заняткі праводзіліся на арэндных плошчах у 6 месцах горада). Аднак у сувязі з адкрыццём новых факультэтаў і аддзяленняў, што прывяло да росту набору студэнтаў, зноў адзначаліся цяжкасці з забеспячэннем вучэбнымі аўдыторыямі. Таму па рашэнні рэктарата інстытута пад вучэбныя аўдыторыі было абсталявана 15 пакояў першага паверха інтэрната па Омскаму завулку. У 1964/65 навучальным годзе 250 студэнтаў інстытута пражывалі ў інтэрнатах іншых ВНУ Мінска (100 чалавек у БДУ па вул. Дзімірова, 150 – у інтэрнаце БПІ па вул. Я.Коласа), а 278 чалавек – на прыватных кватэрах, якія аплачваў інстытут.

У гэтай сувязі рэктарат трымаў пад пастаянным кантролем гэта пытанне і не раз звяртаўся да Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР з просьбай аб своечасовым пачатку будаўніцтва новага вучэбнага корпуса па Вайсковым завулку, намечанага на 1965 г., а таксама новага інтэрната для студэнтаў [3, арк. 3–7]. Пачатае ў 1965/66 навучальным годзе будаўніцтва новага вучэбнага корпуса па Вайсковым завулку было завершана амаль праз год, у лістападзе 1966 г. Вучэбная плошча трох карпусоў дасягнула 8379 м². У 1966/67 навучальным годзе рабочая плошча на аднаго студэнта склала 3,2 м², тады як праз год зменшылася да 2,88 м² [4, арк. 3]. Створаная з пачатку 1960-х гадоў матэрыяльна-тэхнічная база дазволіла інстытуту за дзесяцігоддзе павялічыць колькасць студэнтаў дзённага аддзялення больш чым утрая. Калі ў 1961/62 навучальным годзе на стацыянары налічвалася 990 студэнтаў, дык на 1 студзеня 1970 г. іх колькасць вырасла да 3260 чалавек. На вячэрнім аддзяленні навучаліся 386 студэнтаў, на завочным – 397 [5, арк. 4]. У канцы 1960-х пачалося будаўніцтва чацвёртага корпуса інстытута, дзе планавалася размясціць актавую і фізкультурную залы.

1 верасня 1965 г. інстытут атрымаў новы корпус інтэрната на 630 месцаў па вул. Слясарнай. Калі на 01.07.1965 г. у інтэрнатах пражывалі 700 студэнтаў, праз год гэта лічба вырасла да 887 чалавек: у 1964/65 навучальным годзе фактычны працэнт забяспечанасці інтэрнатамі студэнтаў стацыянара складаў 28,8 %, пасля ўвядзення інтэрната – 51,6 %. З таго часу інстытут меў ужо 2 карпусы на 1080 месцаў [6, арк. 4].

Вялікая ўвага надавалася забяспечанасці інстытута, якая на той час лічылася добрай, абсталяваннем і вучэбнай літаратурай. Пры ўсіх кафедрах працавалі спецыяльныя кабінеты, у якіх меліся даведнікі, слоўнікі, наглядныя дапаможнікі і іншыя матэрыялы, неабходныя для самастойнай працы студэнтаў па кожным прадмеце. У інстытуце была створана спецыяльная фанетычная лабараторыя, абсталяваная найноўшай тэхнікай, а таксама спецыяльнымі кабінамі, у якіх студэнты маглі праслухоўваць узоры замежнай мовы, запісваць і праслухоўваць сваю мову для выпрацоўкі правільнага маўлення. У працэсе навучання замежным мовам максімальна выкарыстоўвалася кіно; была абсталявана спецыяльная кінастудыя, апроч таго, заняткі з прымяненнем кіно праводзіліся ў актавай зале, дзе была пастаўлена новая апаратура. Бібліятэка інстытута на пачатак 1960-х гадоў мела 155 058 тамоў кніг і 56 196 тамоў часопісаў. На 1 ліпеня 1970 г. яе фонд значна павялічыўся і складаў 401 840 экзэмпляраў кніг, часопісаў, аўтарэфератаў (толькі за 1969/70 навучальны год былі набыты 32 398 экзэмпляраў новай літаратуры) [4, арк. 132].

Галоўную задачу рэктарат бачыў у забяспечанасці інстытута навукова-педагагічнымі кадрамі. Так, на 1 ліпеня 1961 г. у інстытуце на прафесарска-выкладчыцкіх пасадах працавалі 98 чалавек (58 жанчын і 40 мужчын), з якіх 36 былі членамі КПСС, 6 – членамі ВЛКСМ і 56 – беспартыйнымі. У ВНУ працавалі 16 дацэнтаў і кандыдатаў навук, 57 старшых выкладчыкаў, 25 выкладчыкаў і асістэнтаў. Нацыянальны склад быў наступным: беларусы – 43, рускія – 37, яўрэі – 14, украінцы – 3 і 1 прадстаўнік іншай нацыянальнасці. Са стажам да 5 гадоў працавалі 5 чалавек, да 10 – 46, звыш 10 гадоў – 47 чалавек [2, арк. 5].

На 01.07.1961 г. у інстытуце было 880 студэнтаў, з якіх на I курсе вучыліся 276, на другім – 191, на трэцім – 145, на чацвёртым – 137, на пятым – 131 студэнт. Па факультэтах гэта карціна бала наступнай: на факультэце англійскай мовы ўсяго было 349 студэнтаў, з іх: на першым курсе – 131, на другім – 86, на трэцім – 61, на чацвёртым – 47, на пятым – 24; з іх хлопцаў – 51, дзяўчат – 298; беларусаў – 205, рускіх – 115, яўрэяў – 13, украінцаў – 8, палякаў – 7, іншых – 1; па сацыяльным паходжанні: з рабочых – 82, служачых – 194, іншых – 21. На факультэце французскай мовы было 149 студэнтаў, з іх хлопцаў – 6, дзяўчат – 143; членаў ВЛКСМ – 145, беспартыйных – 4; беларусаў – 96, рускіх – 40, украінцаў – 7, яўрэяў – 4, палякаў – 2; па паходжанні: са служачых – 78, рабочых – 51, сялян – 20. На факультэце нямецкай мовы было ўсяго 335 студэнтаў, з іх хлопцаў – 69, дзяўчат – 266; членаў УКП (б) – 3, членаў ВЛКСМ – 321, беспартыйных – 11; беларусаў – 252, рускіх – 55, палякаў – 7, яўрэяў – 7, украінцаў – 13, іншых – 1; з рабочых – 69, служачых – 126, сялян – 138, іншых – 2. Па выніках летняй сесіі 1960/61 навучальнага года паспяховасць складала 91,4 % [2, Арк. 13–43].

У 1961/62 навучальным годзе ў інстытуце вучэбны працэс забяспечвалі 10 кафедраў, у тым ліку: гісторыі КПСС, палітэканоміі і філасофіі, лексікалогіі і фанетыкі англійскай мовы, граматыкі і гісторыі англійскай мовы, лексікалогіі і фанетыкі нямецкай мовы, граматыкі і гісторыі нямецкай мовы, французскай мовы, рускай і беларускай мовы і літаратуры, педагогікі

і псіхалогіі, фізічнага выхавання і спорту [7, арк. 5]. Фактычна на кафедрах не працавала ні аднаго прафесара і толькі 5 дацэнтаў, хаця па штатным раскладзе павінны былі быць 2 прафесары і 12 дацэнтаў. Са 100,5 адзінак штатных выкладчыкаў замежных моў толькі 8 мелі вучоную ступень і званне (кандыдаты навук і дацэнты). За 8 гадоў (на 01.01.1970) колькасць штатных выкладчыкаў вырасла са 130 да 550, пры гэтым частка прафесарска-выкладчыцкага складу (ПВС) са ступенямі і званнямі – з 18 да 108 чалавек. Калі ў 1961/62 навучальным годзе ў інстытуце было 5 кафедраў замежных моў і на іх працавалі толькі 5 кандыдатаў навук, дык на пачатак 1970 г. у інстытуце налічвалася 21 кафедра замежных моў, дзе працавалі 65 выкладчыкаў са ступенямі і званнямі, у тым ліку 3 штатныя прафесары і дактары навук [4, арк. 79].

Забяспечанасць інстытута навукова-педагагічнымі кадрамі ў сярэдзіне 1960-х гг. прадстаўлена ў табл. 1.

Т а б л і ц а 1

Звесткі аб ПВС па стане на 01.07.1964 г., штатных адзінак [8, арк. 3]

| Кафедры | Усяго па штату | Кандыдаты навук і дацэнты | Кандыдаты навук | Без ступені |
|---|---|---|---|---|
| Гісторыі КПСС | 11 | 4 | 3 | 2 |
| Філасофіі і палітэканоміі | 8 | 4 | 2 | 2 |
| Педагогікі і псіхалогіі | 9 | - | 3 | 4 |
| Агульнага мовазнаўства | 12 | 2 | 2 | 4 |
| Методыкі выкладання | 5 | 1 | - | 3 |
| Фанетыкі нямецкай мовы | 23,5 | - | - | 10 |
| Граматыкі і гісторыі нямецкай мовы | 15 | 1 | - | 8 |
| Лексікалогіі нямецкай мовы | 14 | 2 | - | 12 |
| Фанетыкі англійскай мовы | 37 | 1 | 1 | 8 |
| Граматыкі і гісторыі англійскай мовы | 22 | - | 2 | 11 |
| Лексікалогіі англійскай мовы | 20 | 1 | 2 | 16 |
| Фанетыкі французскай мовы | 17 | - | - | 3 |
| Лексікалогіі і граматыкі французскай мовы | 18 | 2 | 2 | 11 |
| Іспанскай мовы | 7,5 | - | - | 4 |
| Фізічнага выхавання | 7,5 | - | - | 4,5 |

Не менш важным з’яўляўся ўзроставы склад выкладчыкаў інстытута, што набыло асаблівае значэнне ў сярэдзіне 1960-х гадоў. Так, з 265 выкладчыкаў толькі кожны дзясяты быў ва ўзросце ад 50 гадоў і вышэй, тады як абсалютная большасць прафесарска-выкладчыцкага складу мела ўзрост да 49 гадоў (табл. 2). З іх па нацыянальнай прыналежнасці: беларусаў – 117, рускіх – 110 чалавек, яўрэяў – 22, украінцаў – 13, іншых – 3. З агульнай колькасці ПВС да ліку жанчын адносіліся 64,9 % загадчыкаў кафедрамі, дацэнтаў, старшых выкладчыкаў, асістэнтаў і выкладчыкаў.

Т а б л і ц а 2

Характарыстыка ПВС па ўзросце на 01.09.1964 г., колькасць чалавек [9, арк. 11]

| Узрост | Загадчыкі кафедраў | Дацэнты і кандыдаты навук | Асістэнты | Ст. выкладчыкі і выкладчыкі | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| Да 29 гадоў | - | - | 40 | 33 | 73 |
| 30 – 39 | 6 | 10 | 7 | 73 | 96 |
| 40 – 44 | 3 | 7 | 1 | 34 | 45 |
| 45 – 49 | 3 | 6 | - | 16 | 25 |
| 50 – 54 | 2 | 1 | - | 7 | 10 |
| 55 і вышэй | 3 | 7 | - | 6 | 16 |
| Увогуле | 17 | 31 | 48 | 169 | 265 |

У 1961/62 навучальным годзе працягвалася падрыхтоўка спецыялістаў па двух замежных мовах з тэрмінам навучання 5 гадоў. У гэтым жа годзе ў якасці другой спецыяльнасці была ўведзена іспанская мова, у 1965/66 – італьянская. У 1962 г. у інстытуце быў адкрыты прыём на аддзяленне іспанскай мовы з 5-гадовым тэрмінам навучання, якое праз чатыры гады набыло статус факультэта. У 1962 г. было адкрыта і вячэрняе аддзяленне з тэрмінам навучання 5 гадоў. Падрыхтоўка спецыялістаў ажыццяўлялася па адной замежнай мове: англійскай, нямецкай ці французскай. З 1963 г. на дзённым аддзяленні былі ўстаноўлены 2 тэрміны навучання – пяцігадовы і чатырохгадовы. У 1964 г. адкрыта перакладчыцкае аддзяленне на 1 і 2 курсах факультэтаў нямецкай, англійскай і французскай моў. Пачалася падрыхтоўка перакладчыкаў-рэферэнтаў па дзвюх замежных мовах. Назіралася тэндэнцыя ўстойлівага росту колькасці студэнтаў на ўсіх формах навучання: калі на 1 верасня 1948 г. іх было 362 чалавекі, на 01.09.1959 г. – 1160 чалавек, дык на 1.01.1967 – 3137 чалавек [9, арк. 22–23].

Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР прыняло пастанову з 1 верасня 1962 г. адкрыць аспірантуру па германскіх і раманскіх мовах і па методыцы выкладання замежных моў пры Мінскім інязе [7, арк. 9–10]. Падрыхтоўка вялася па германскай і раманскай філалогіі і тэорыі мовазнаўства. У першы год на германскія мовы былі прыняты 4 чалавекі, у 1963 г. – 5, у 1964 г. – 2; на раманскія, адпаведна, 1 чалавек у 1962 г., адзін – у 1962 г. і 2 – у 1964 г. Па тэорыі мовазнаўства прынялі ў 1964 г. 2 чалавекі. У 1964/65 навучальным годзе праходзілі падрыхтоўку ў аспірантуры ўсяго 17 чалавек. Першы выпуск аспірантаў адбыўся ў 1965 г., калі аспірантуру скончылі 4 чалавекі, у 1966 г. – таксама 4 чалавекі. З 1965 г. інстытут атрымаў права абароны кандыдацкіх дысертацый па заходнееўрапейскіх мовах спачатку на Аб’яднаным міжвузаўскім вучоным савеце па гуманітарных дысцыплінах, а потым на вучоным савеце па філалагічных навуках пры БДУ імя У.І. Леніна. На 01.01.1967 г. у аспірантуры навучаліся 25 чалавек. Агульны працэнт абароны дысертацый складаў 50 % (табл. 3).

Т а б л і ц а 3

Навучанне ў аспірантуры па стане на 01.01.1967 г.,
колькасць чалавек [9, арк. 21]

| Спецыяльнасць | 1-ы год навучання | 2-і год навучання | 3-і год навучання | Усяго |
|---|---|---|---|---|
| Германскія мовы | 4 | 2 | 4 | 10 |
| Раманскія мовы | 2 | 3 | 3 | 8 |
| Тэорыя мовазнаўства | 2 | 1 | 1 | 4 |
| Методыка | 2 | 1 | | 3 |
| Усяго | 10 | 7 | 8 | 25 |

Усяго ў другой палове 1960-х гадоў абаранілі кандыдацкія дысертацыі 35 аспірантаў і выкладчыкаў інстытута, з іх 24 чалавекі – у апошнія 3 гады. Да таго ж былі абаронены 2 доктарскія – З.Н. Левіт і Г.Я. Панкрац. На працягу 1969/70 навучальнага года да абароны падрыхтаваны 2 доктарскія і 13 кандыдацкіх дысертацый.

Павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў пастаянна знаходзілася ў цэнтры ўвагі рэктарата: яно праводзілася шляхам залічэння ў гадавую аспірантуру (6 чалавек у 1969/70 навучальным годзе), прымацавання ў якасці саіскальнікаў да кафедраў (11 чалавек), перавод маладых выкладчыкаў на пасады стажораў-даследчыкаў (5 чалавек), перавода дацэнтаў на пасады старшых навуковых супрацоўнікаў (4 чалавекі), шляхам накіравання выкладчыкаў на факультэт павышэння кваліфікацыі пры Маскоўскім педінстытуце замежных моў імя М. Тарэза (калі ў 1968/69 навучальным годзе ў мэтавую і гадавую аспірантуру былі накіраваны 8, дык у 1969/70 – 10 чалавек), шэсць выкладчыкаў там жа павышалі кваліфікацыю, столькі ж выкладчыкаў павышалі кваліфікацыю па грамадскіх навуках. Акрамя таго, для 9 чалавек былі арганізаваны стажыроўкі ў іншыя гарады краіны. 17 выкладчыкаў закончылі вышэйшыя двухгадовыя педагагічныя курсы ў Маскве і Ленінградзе .

У 1969/70 навучальным годзе былі таксама арганізаваны стажыроўкі выкладчыкаў у краіны, мова якіх выкладалася ў інстытуце. На стажыроўку выехалі 24 выкладчыкі, у тым ліку: у ГДР – 7 на тэрмін ад 10 да 12 месяцаў і 2 чалавекі на 2 месяцы, Аўстрыю – 2 чалавекі на 1 месяц, у ЗША 5 чалавек на 3 месяцы, у Англію – 1 чалавек на 9 месяцаў, у Францыю – 3 чалавекі на 10 месяцаў і 4 чалавекі на 2 месяцы [4, арк. 79–80].

З верасня 1960 г. у інстытуце былі арганізаваны і працавалі 2-гадовыя курсы замежных моў для спецыялістаў, якія накіроўваліся за мяжу. У 1969/70 навучальным годзе на курсах навучаліся 93 чалавекі [4, арк. 84].

З 1966 г. інстытут шырока выкарыстоўвае ў навучальным працэсе тэлебачанне (у галоўным корпусе знаходзілася тэлевізійная ўстаноўка замкнёнай сістэмы (без выхаду ў эфір), а ў аўдыторыях – 14 шырокаэкранных тэлевізараў). У 1967/68 навучальным годзе зманціравана і пачала выкарыстоўвацца ў вучэбным працэсе фанетычная аўдыявізуальная ўстаноўка

“Седамель” французскай вытворчасці. Яна складаецца са стала выкладчыка са спецыяльным магнітафонам, прайгравальнікаў з пультам кіравання на 24 рабочыя месцы, 24 кабін з індывідуальнымі двухканальнымі магнітафонамі, магнітафоннымі запісамі на англійскай, французскай, нямецкай, іспанскай мовах, падручнікаў і дыяфільмаў.

У інстытуце створана фанетычная лабараторыя вуснай мовы, куды ўваходзяць студыі запісу, 3 залы праслухоўвання (на 28, 52 і 153 месцаў) для самастойнай работы студэнтаў, 2 кабіна-класы, спецыяльныя аўдыторыі, абсталяваныя магнітафонамі і рэгулятарамі гуку, кабінет з 24 кабінамі аўдыявізуальнай устаноўкі “Седамель”, кабінет сінхроннага перакладу з 200 апаратамі “Сімултон”, прыстасаваных для адначасовага перакладу і магчымасці пачуць пераклад на пяці мовах, 2 залы на 20 – 24 месцы, адзін для работы з фільмамі, другі – с дыяфільмамі. У навучальным працэсе выкарыстоўваецца больш за 200 магнітафонаў; клас праграмнага навучання, укамплектаваны 15 машынамі для навучання “Мінчанка”; навукова-даследчая лабараторыя вуснай мовы; лабараторыя вучэбнага кіно, 2 вялікія кіназалы [5, арк. 4]. Адкрылася зала сінхроннага перакладу, якую з падачы рэктара Мінскага іняза называлі “малой залай ААН”. У 1970 г. у інстытуце была ўсталявана вылічальная машына “Мінск–22”, эксплуатацыя якой запатрабавала плошчу ў 120 $м^2$ [5, арк. 6].

Навукова-даследчая работа (НДР) у інстытуце вялася на працягу 1960-х гадоў на трох напрамках.

1. НДР грамадска-палітычнага характару, накіраваная на фарміраванне светапогляду і сацыяльна-палітычнага аблічча будучага настаўніка, які закліканы грамадствам выхоўваць маладое пакаленне ў духу камуністычнай ідэалогіі.

2. НДР педагагічнага характару, якая адлюстроўвае прафесійную спецыфіку інстытута і звязана з неабходнасцю ўзбройваць будучага настаўніка найбольш эфектыўнымі метадамі і прыёмамі навучання. Асаблівая ўвага ў інстытуце надаецца пытанням павышэння эфектыўнасці навучання замежным мовам. У сувязі з гэтым навукоўцы інстытута распрацоўваюць тэмы: праграмнае навучанне замежным мовам у школе і ВНУ; мадэлі і ўзоры ўрокаў; сістэма праграмаваных практыкаванняў для навучання мове; аўдыявізуальныя сродкі навучання замежным мовам. Пачынаючы з 1962/63 навучальнага года супрацоўнікі інстытута штогод выдаюць падручнікі, вучэбныя дапаможнікі і артыкулы.

3. НДР філалагічнага (пераважна лінгвістычнага) зместу, звязаная з характарам профільнага прадмета навучання ў інстытуце і канкрэтнымі мовамі ці вызначанымі аспектамі гэтых моў, якія вывучаюцца ў інстытуце). Найбольш важныя даследаванні на бягучы час вядуцца па фаналогіі, фразеалогіі і статыстыцы мовы [10, арк. 26].

Станоўчай прыкметай выканання НДР у 1960-я гады становіцца тэндэнцыя па аб’яднанні намаганняў супрацоўнікаў інстытута вакол важных праблем мовазнаўства і методыкі навучання замежным мовам. З гэтага пункту

гледжання ўяўлялі асаблівы інтарэс вынікі работы, якая вялася ў творчай групе "Статыстыка мовы" на чале з прафесарам Р.Г. Піятроўскім (г. Ленінград), накіраваным па рашэнні Прэзідыума АН СССР у інстытут для аказання дапамогі ў правядзенні навуковых даследаванняў. Група працавала ў шчыльным кантакце з мовазнаўцамі Расіі (Ленінград), Дагестана, Казахстана і Малдавіі. Работы вяліся шырокім фронтам, галоўная ўвага была накіравана на даследаванне статыстычнага размеркавання словаформ і словазлучэнняў і інфарматыўнай вагі гэтых лінгвістычных адзінак як паасобку, так і ў сукупнасці; адначасова статыстычна ацэньваліся розныя прыёмы аўтаматычнага ўстанаўлення значэння лінгвістычных адзінак і, у прыватнасці, вырашалася задача адрознення амонімаў. Пачыналіся работы па аўтаматычным аналізе моўных тэкстаў на аснове статыстычных даных. Калектыў групы шырока выкарыстоўваў вылічальную тэхніку не толькі для ацэнкі верагоднасці і матэматычнага аналізу лінгвістычных даных, але і вызначэння размеркавання лінгвістычных адзінак у тэксце [10, арк. 32].

У 1970 г. супрацоўнікі інстытута абаранілі 9 кандыдацкіх дысертацый па грамадскіх навуках, рамана-германскім мовазнаўстве і літаратуразнаўстве, методыцы выкладання замежных моў. Акрамя таго, падрыхтаваны да абароны 6 кандыдацкіх і 3 доктарскія дысертацыі. Усяго за 1966–70 гг. у інстытуце абаронены 40 дысертацый, з іх 39 кандыдацкіх і адна доктарская (у 1966 г. – 5, 1967 г. – 11, 1968 г. – 8, 1969 г. – 7 і ў 1970 г. – 9 абароненых дысертацый) [11, арк. 58] (табл. 4).

Табліца 4

Навуковы характар абароненых дысертацый у 1970 г. [11, арк. 57].

| № п/п | Прозвішча і ініцыялы | Спецыяльнасць |
|---|---|---|
| 1 | Ігнатовіч М.Б. | Гісторыя КПСС |
| 2 | Штундэр Я.Ч. | Методыка выкладання |
| 3 | Картэс Л.П. | Літаратура краін Заходняй Еўропы і Амерыкі |
| 4 | Шчука К.К. | Германскія мовы |
| 5 | Воўшын Я.М. | Германскія мовы |
| 6 | Зубава Т.Я. | Раманскія мовы |
| 7 | Батура С.М. | Раманскія мовы |
| 8 | Сяднёва Л.А. | Раманскія мовы |
| 9 | Зубаў А.В. | Структурная, прыкладная і матэматычная лінгвістыка |

У навуковай рабоце інстытута ў 1967/68 навучальным годзе прымалі ўдзел каля 400 студэнтаў, з якіх каля 180 займаліся ў навуковых студэнцкіх кружках ці працавалі індывідуальна над тэмай пад кіраўніцтвам 52 кваліфікаваных навуковых кіраўнікоў. Каля 260 студэнтаў займаліся ў спецкурсах і спецсемінарах ці факультатыўна вывучалі італьянскую, французскую мовы, латынь і інш. [6, арк. 99].

Грамадскія кафедры інстытута актыўна рыхтавалі студэнтаў да ўдзелу ў конкурсах. Так, кафедра гісторыі КПСС штогод выконвала ад 8 да 10 конкурсных работ. Напрыклад, з 10 работ, прадстаўленых у 1969 г. на рэспублі-

канскі конкурс, 2 атрымалі першую катэгорыю, 6 – другую і 2 – трэцюю; 8 студэнтаў атрымалі граматы Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі і памятныя медалі. Рабоце студэнткі 4 курса С.У. Буракоўскай "Путь Британии к социализму" была прысуджана другая катэгорыя на Усесаюзным конкурсе [12, арк. 6–10].

31 студзеня 1966 г. быў створаны Рэдакцыйна-выдавецкі савет інстытута на чале з прарэктарам на навуковай рабоце кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам У.В. Макаравым; наместнікам старшыні была прызначана кандыдат філалагічных навук, дацэнт В.І. Тур. Усяго ў склад савета ўвайшлі 11 чалавек, з якіх 6 загадчыкаў кафедраў. 2 выконваючых абавязкі загадчыкаў і адзін дацэнт, кандыдат педагагічных навук. У 1969 г. быў зацверджаны новы склад Рэдакцыйна-выдавецкага савета агульнай колькасцю 12 чалавек, куды ўваходзілі 2 прарэктары, 2 дэканы, 6 загадчыкаў кафедраў, 2 прафесары і адзін дацэнт [13, арк. 7].

У сярэдзіне 1960-х гадоў у складзе выкладчыкаў інстытута працавалі 70 чалавек, хто ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны праходзіў службу ў радах Чырвонай Арміі, аказваў супраціўленне на акупаванай тэрыторыі ў партызанскіх атрадах і ў падполлі, у тым ліку: выкладчыкаў – 51 чалавек; адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў – 19 чалавек. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі ў перыяд вайны 58 чалавек, паранена ў баях – 15 [9, арк. 10].

Другое дзесяцігоддзе развіцця Мінскага іняза на чале з рэктарам Ф.П. Шмыгавым – важная старонка жыцця калектыву выкладчыкаў, студэнтаў і супрацоўнікаў інстытута, якія і ў пачатку XXI стагоддзя нясуць эстафету лінгвістычных спраў у розных сферах палітыкі, эканомікі, навукі, культуры, адукацыі, выхавання, а таксама міжнародных і міждзяржаўных адносін.

## ЛІТАРАТУРА

1. Личное дело Шмыгова Фрола Парфирьевича // Архіў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. – Воп. 5. – Спр. 1699.
2. Отчет о работе Минского государственного педагогического института иностранных языков в 1960/1961 учебном году // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд 1154. – Воп. 1. – Спр. 194.
3. Отчет о работе Минского государственного педагогического института иностранных языков в 1964/1965 учебном году // НАРБ. – Фонд 1154. – Воп. 1. – Спр. 277.
4. Отчет о работе Минского государственного педагогического института иностранных языков в 1969/1970 учебном году // НАРБ. – Фонд 1154. – Воп. 1. – Спр. 487.
5. Отчет о работе Минского государственного педагогического института иностранных языков в 1967/1968 учебном году // НАРБ. – Фонд 1154. – Воп. 1. – Спр. 401.
6. Отчет о работе Минского государственного педагогического института иностранных языков в 1964/1965 учебном году // НАРБ. – Фонд 1154. – Воп. 1. – Спр. 316.

7. Отчет о работе Минского государственного педагогического института иностранных языков в 1961/1962 учебном году // НАРБ. – Фонд 1154. – Воп. 1. – Спр. 214.
8. Отчет о работе Минского государственного педагогического института иностранных языков в 1963/1964 учебном году // НАРБ. – Фонд 1154. – Воп. 1. – Спр. 251.
9. Справка о развитии Минского государственного педагогического института иностранных языков за период с 1948 по 1965 гг. // НАРБ. – Фонд 1154. – Воп. 1. – Спр. 357.
10. Справка о развитии научных исследований в Минском государственном педагогическом институте иностранных языков за период с 1948 по 1965 гг. // НАРБ. – Фонд 1154. – Воп. 1. – Спр. 357.
11. Отчет о научной работе Минского государственного педагогического института иностранных языков в 1970 году // НАРБ. – Фонд 1154. – Воп. 1. – Спр. 357.
12. Отчет о выполнении плана научно-исследовательской работы членами кафедры история КПСС по Минскому государственному педагогическому институту иностранных языков за 1970 год // НАРБ. – Фонд 1154. – Воп. 1. – Спр. 492.
13. Приказ по Минскому государственному педагогическому институту иностранных языков № 170 от 26 августа 1969 г. // НАРБ. – Фонд 1154. – Воп. 1. – Спр. 417.

*Поступила в редакцию 15.04.13*